# ШТУРМАВІКІ ІШЛІ НА ЦЭЛЬ

Адзін за другім рабілі заходы над варожым аэрадромам нашы штурмавікі. І пасля кожнага круга ўзнімаліся над зямлёй слупы дыму і агню. Налёт быў нечаканы, самалёты з чырвонымі зоркамі на крылах у адзін міг з'явіліся над лётным полем. Толькі тады загаварылі варожыя зеніткі. Але ўжо агонь набіраў сілу — гарэлі на зямлі варожыя самалёты, аэрадромныя пабудовы.

— Яшчэ адзін заход! — прагучаў загад камандзіра эскадрыллі капітана Івана Авекава. — Бі фашысцкіх гадаў!

Крута развярнуліся нашы штурмавікі, і, здавалася, ужо нішто не можа ўцалець там, унізе, у гэтым сапраўдным пекле...

Аб тым вылеце яшчэ доўга ўспаміналіся ў часці. Лётчыкі расказвалі, што яны пачалі ўжо набіраць вышыню, калі з дымавой заслоны вынырнуў камандзірскі «Іл». Машына адразу ўзяла ўправа, але ў гэты момант прамое пападанне снарада страсянула самалёт. Ён яшчэ працягнуў некалькі соцень метраў, а потым урэзаўся ў зямлю. Так загінуў камандзір эскадрыллі наш зямляк Іван Авекаў. Гэта быў 178-ы баявы вылет адважнага сокала.

Іван Аўдзеевіч Авекаў нарадзіўся на станцыі Асінаўка Дубровенскага раёна. Яшчэ з дзяцінства марыў стаць лётчыкам. Юнак захапляўся літаратурай і музыкай, пісаў вершы, іграў на гітары і гармоніку. Ні адзін школьны вечар не абыходзіўся без удзелу Івана Авекава. Яму і быць бы артыстам. Але клікала юнака неба.

Пасля школы ён доўга не разважаў, кім быць. Толькі лётчыкам — гэта Іван рашыў даўно і канчаткова. Так і прывяла мара камсамольца ў ваенна-авіяцыйнае вучылішча. Закончыў яго перад самай вайной, атрымаў званне лейтэнанта.

Першы баявы вылет малады афіцэр зрабіў 23 чэрвеня 1941 года. Іх яшчэ будзе многа, вельмі многа за няпоўныя два гады франтавога жыцця. Але ў першым жа налёце Іван Авекаў праявіў разважлівасць і вытрымку. Тады іх група штурмавікоў нанесла значныя страты фашыстам.

У цяжкі перыяд абароны сталіцы наш земляк нясе вахту ў падмаскоўным небе. Бывала, што за адзін дзень рабілі па некалькі вылетаў. Вораг ірваўся ў Маскву. Па аэрадромах, танкавых калонах, артылерыйскіх батарэях наносілі ўдары нашы штурмавікі. Баявы рахунак лейтэнанта Авекава рос з кожным днём. Ён збіў два самалёты, тры разбамбіў на зямлі, знішчыў некалькі танкаў. Камуніст Авекаў у самую цяжкую часіну верыў у нашу перамогу і ўсё рабіў, каб наблізіць гэты дзень.

У пачатку 1942 года полк, у якім служыў камандзір звяна Авекаў, перабазіраваўся ў раён горада Ялец. Адсюль адважны сокал зрабіў большасць сваіх вылетаў, непадалёку ад Яльца ён і загінуў.

Толькі за адзін 1942 год самалёт Авекава сто сорак разоў узнімаўся ў паветра. Камандзір звяна асабіста знішчыў 16 танкаў, 5 самаходных гармат, 58 аўтамашын, рачную пераправу. Павялічыўся і лік збітых самалётаў. На гімнасцёрцы лётчыка заззялі ордэны Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны першай і другой ступеней, Чырвонай Зоркі, медалі. Іван Авекаў павышаны ў званні, ён стаў капітанам, прызначаны камандзірам эскадрыллі.

Любілі і паважалі свайго камандзіра пілоты. За асабістую храбрасць, за высокае пачуццё таварыскасці, якое так неабходна ў баі.

У палку часта расказвалі такі эпізод. У лютым 1943 года ў час чарговага вылету фашысты падбілі самалёт баявога таварыша камандзіра лейтэнанта Кавалёва. Ён вымушан быў вяртацца на свой аэрадром. Але ў гэты час у экіпажа скончыліся кулямётныя дыскі, і ён не мог абараняцца. Тады на дапамогу прыйшоў камандзір. Пад яго прыкрыццём пашкоджаны самалёт Кавалёва дацягнуў да сваёй тэрыторыі і там прызямліўся.

17 красавіка 1943 года быў той апошні, 178-ы вылет капітана Авекава. Вялікія страты нанеслі нашы сокалы фашыстам. Але і камандзір не вярнуўся з задання, ён загінуў смерцю героя.

Ва ўзнагародным лісце адзначалася, што капітан Авекаў асабіста збіў 15 самалётаў ворага, зрабіў адзін таран і 23 знішчыў на аэрадромах. На гэтым дакументе стаіць подпіс камандуючага Цэнтральнага фронта генерала арміі К. Ракасоўскага.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 жніўня 1943 года Івану Аўдзеевічу Авекаву пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Лётчык пахаваны ў горадзе Данкоў-на-Доне Ліпецкай вобласці. Непадалёку ад гэтых мясцін ён здзейсніў свой апошні подзвіг. У гарадах і рабочых пасёлках Ліпецкай і Варонежскай абласцей, у небе якіх змагаўся беларускі сокал, некалькі школ носяць імя Авекава.

**А. ПАЎЛОВІЧ.**